УДК 392.5(476.2-37Брагін)

**К. Г. Здор**
*Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар*

# ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БРАГІНШЧЫНЫ: МЯСЦОВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ АСОБНЫХ ВЁСАК)

*У артыкуле, прысвечаным вясельнай абраднасці Брагіншчыны, засяроджваецца ўвага на традыцыях вясельнай абраднасці асобных вёсак. Аўтар на аснове ўласных экспедыцыйных матэрыялаў, запісаных ад жыхароў в. Шкураты Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, а таксама на фактычным матэрыяле, апублікаваным у фальклорным зборніку, аналізуе асноўныя абрадавыя этапы вяселля і вылучае адметныя мясцовыя рысы.*

Беларускае вясковае вяселле заўсёды вылучалася захаванасцю ў найбольшай ступені абрадавых этапаў і архаічнасцю звязаных з імі рытуалаў, багаццем песеннага суправаджэння. Традыцыі вясельнай абраднасці важна зберагаць і перадаваць нашчадкам.

Вяселле па струтуры ўяўляе сабой складаны комплекс абрадаў, звычаяў, песень, урачысты характар выканання якіх быў скіраваны на замацаванне шлюбных адносін маладых. Як слушна адзначыла Л. А. Малаш, «жывучасць вясельнай абраднасці тлумачыцца вялікай важнасцю сям’і, звязанай з асноўнай умовай існавання народа – яго ўзнаўленнем» [1, с. 126]. У сістэме традыцыйнай беларускай вясельнай абраднасці можна вылучыць тры перыяды: давясельны, уласна вясельны і паслявясельны, кожны з якіх складаўся з пэўных абрадавых этапаў, якія паслядоўна змянялі адзін аднаго. Звернемся да характарыстыкі мясцовай спецыфікі вяселля ў вёсках Вязок, Савічы, Міхнаўка, Шкураты Брагінскага раёна Гомельскай вобласці.

Першым этапам вясельнага абраду ў гэтых вёсках з’яўляецца сватанне. Звычайна ходзяць сватаць бацька жаніха, хросны бацька, сват, іншы раз і сам жаніх. Зыходзячы з уласна запісанага фактычнага матэрыялу ў в. Шкураты, у сваты хадзілі вечарам у суботу: «Абычна ў сваты шлі ў суботу. Хадзілі хросны, татка і дзядзя жаніха. Маглі ўзяць і самога жаніха з сабой, але так было рэдка, а хоць і бралі, дык прыходзіў ён пазней – калі пазавуць. Калі бацькі дзеўкі сагласныя на сватанне, звалі дочку, а калі і ёй падабаецца хлопец, тады бацькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канчаткова згаджаліся» (запісана ў в. Кананаўшчына ад Грушэнка Юліі Андрэеўны, 1951 г. н., раней пражывала ў в. Шкураты).

Падчас сватання адбывалася гутарка паміж сватамі і бацькамі нявесты ў іншасказальнай форме. Напрыклад, у в. Вязок «у хаце нявесты адзін са сватоў гаворыць: “Мо ў вас цёлка е, дык мы купім”. Маці нявесты адказвае, што не мае. Тады сваты гавораць: “Мы чулі многа добрага пра вашу дачушку, а ў нас ёсць галубок да пары вашай галубцы”» (запісана ў г. Гомелі ад перасяленак з в. Вязок) [2, с. 28].

Калі нявеста пагаджалася выйсці замуж, то ў мясцовай традыцыі гэтай вёскі было прынята разразаць хлеб на дзве палавінкі: «Нявеста тым часам гатовіць стол, нявеста з маткай накрывае стол, жаніх прывозіць хлеб. Еслі нявеста згодна, яна разразае хлеб. Нявеста дарыць падарункі, назначае ўрэмя заручын» [1, с. 28].

Заручыны былі наступным абрадавым этапам і прызначаліся праз тыдзень. Паводле народных вераванняў, нявесце трэба было першай убачыць жаніха, калі ён са сватамі заходзіў у хату, у такім выпадку, лічылася, яна будзе галоўнай у сям’і: «На заручыны прыязджае ўся радня і нявесты, і жаніха. Калі жаніх заходзіць у хату, нявеста хаваецца, каб яе не ўбачылі, а сама жаніха хоча пабачыць першай, каб у сямейным жыцці верхаводзіць мужам. Нявеста выходзіць да гасцей, вітаецца з імі.

Госці садзяцца хто дзе, за сталы не сядаюць. Нявеста з жаніхом ідуць клікаць сваякоў нявесты, прыходзяць і ўсе разам садзяцца за стол» (в. Вязок) [2, с. 28]. На заручынах гучалі песні, змест якіх узнаўляў асноўныя абрадавыя дзеянні, якія выконваліся падчас гэтага абрадавага этапу:

*Прыехалі на заручыны,*
*Там дзверы закручаны.*
*Мы дзевачку заручылі,*
*Ехалі на запоіны,*
*Там дзверы закованы.*
*Мы ж дзверы адкавалі,*
*Мы дзевачку запівалі* (в. Вязок) [2, с. 28].

Як адзначыла былая жыхарка в. Шкураты Грушэнка Юлія Андрэеўна, 1951 г. н., «за нядзелю ці дзве перад свадзьбай спраўлялі заручыны. Абычна выбіралі пасляабедзенны час якога-небудзь свята або суботы ці васкрасення, таго што ў буднія дні было мала врэмя. На заручыны прыязджала ўся радня з двух бакоў. Сваты казалі:

– У вас – тавар, у нас – купец, глядзіце, які маладзец. Мы прыехалі здалеку, шукаем дзеўку – ясну красачку. А родзічы нявесты адказвалі :



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– Дык у нас многа ясных красачак. За якой жа вы прыехалі? Выбірайце.

Падводзілі к сталу дружак нявесты. Сваты, кагда выбіралі, абзывалі дзевак, пакуль да іх не падвядуць нявесту. Сваты гавораць, што іменна такую красачку шукалі свайму купцу. Потым усе садзіліся за стол» (запісана ў в. Кананаўшчына). З прыведзенага апісання вынікае, што і падчас заручын, як і ў працэсе сватання, таксама адбываўся рытуальны дыялог паміж сватамі і бацькамі нявесты, каб вырашыць пытанне аб шлюбе.

Каравайнай абраднасці надававалася вялікая ўвага, бо з падрыхтоўкай і дзяльбой каравая, зыходзячы з народных вераванняў, былі звязаны дабрабыт і шчасце маладых. Невыпадкова рашчыняць цеста для каравая запрашалі тых жанчын, якія самі ў шлюбе былі шчаслівымі: «Каравай учыняюць замужнія жанчыны, паважаныя, шчаслівыя, якія добра жывуць, і гавораць:

*Із сямі крыніц вада,*
*Із сямі пшаніц мука,*
*Загранічнае масла*
*І яец паўтараста*» (в. Савічы) [2, с.45].

Важным момантам у брагінскім вяселлі быў абрад царкоўнага вянчання, цікавыя звесткі пра які былі запісаны, напрыклад, у в. Міхнаўка: «Вяселле гулялі коньмі. Нявеста к вянцу ехала ўперадзі жаніха на сваім вазу з сяброўкамі, а жаніх – з хлопцамі ззаду на сваім вазу. Пасля вянца нявеста садзілася ў воз жаніха, ехалі першыя. К вянцу запрагалі толькі пару коней і толькі тых, якія стаялі на стойні. Коні гэтыя называліся ўяздныя, і запрагалі толькі лашакоў, кабыл к вянцу не запрагалі. Коням у грыву ўплятаглі ленты, дугі ўпрыгожвалі рознымі кветкамі» (в. Міхнаўка) [2, с. 39]. Як прыгадвала жыхарка в. Шкураты, вяселле ў іх вёсцы «гулялі ў асноўным два дня. У хаце жаніха ўсе збіраліся ехаць па маладую. Калі ў маладога была сястра, яе бралі за свяцілку. Свяцілка ехала з братам да нявесты. За маладой ехалі на кане. Людзі перагароджвалі дарогу доўгай жэрдкай, а за тое, каб пусцілі, трэба быў выкуп – гарэлка» (запісана ад Грушэнка Юліі Андрэеўны, 1951 г. н.). Паводле сведчанняў інфарманта, абавязковым у мясцовым вяселлі быў выкуп маладой: «Друг жаніха выкупліваe ў дзевак маладую: дае грошы, гарэлку. Маладую ён падводзіць да маладога. Свяцілка ў хаце нявесты запальвала свечкі. Госці садзяцца за стол, выпіваюць, пяюць песні» (запісана ў в. Кананаўшчына ад Грушэнка Юліі Андрэеўны, 1951 г. н., раней пражывала ў в. Шкураты).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ад’езд да маладога – адзін з абрадавых этапаў у сістэме брагінскай вясельнай абраднасці, з якім звязаны рытуалы блаславення маладых і развітання нявесты з бацькоўскім домам: «Потым нявесту збіраюцца везці да маладога. Бацька маладой кладзе на стол ікону. Тамада абводзіць маладых тры разы кругом стала, яны цалуюць ікону, і дружок кажа:

– Ці ёсць тут ацец і маць, благаславіце сваё дзіця ў дарогу ўступаці?

Госці адказвалі:

– Бог благаславіць.

Радня маладой строілася ў рад, дружок вёў маладых к возу. Маладая кланялася і прашчалася» (запісана ў в. Конанаўшчына ад Грушэнка Юліі Андрэеўны, 1951 г.н., раней пражывала ў в. Шкураты).

Калі маладыя пад’язджалі да хаты бацькоў жаніха, то яны выходзілі іх сустракаць: «Свякруха адзявала на галаву маладой платок, а свёкар забіраў з рук маладой ікону і нёс яе на кут. Маладых садзілі на кут пад іконамі» (запісана ў в. Конанаўшчына ад Грушэнка Юліі Андрэеўны, 1951 г. н., раней пражывала ў в. Шкураты).

У мясцовай вясельнай традыцыі в. Міхнаўка было прынята, каб маладыя перад ад’ездам абавязкова павячэралі: «Калі маладую забіралі ад бацькоў, то перад тым, як выйсці з хаты, іх садзілі за стол напроціў печы вячэраць. Крыху пасядзеўшы, выходзячы з-за стала, маладая казала: “Спасіба, мама, за хлеб-соль, больш я не пайду за твой стол”» (в. Міхнаўка) [2, с. 41].

Калі ж сустракалі маладых, то «маці жаніха падносіла маладым хлеб-соль, і яны павінны былі яго па разу адкусіць. Лічылася, хто больш адкусіць, той і будзе галавой сям’і. Затым маці благаслаўляла маладых іконай і запрашала ў хату» (в. Міхнаўка) [2, с. 39]. У вясельнай традыцыі Брагіншчыны было прынята, каб нявеста і яе радня сваімі ручнікамі і пасцілкамі, абрусамі ўпрыгожылі хату бацькоў жаніха: «Як нявеста прыязджае да жаніха, хросная, цётка нявесты вывешвае на ікону, вокны прыданае: скацеркі, палаценцы, посцілкі, каб паказаць, з якім прыданым яна прыехала ў хату да жаніха» (в. Вязок) [2, с. 30].

Дзяльба каравая – адзін з найважнейшых абрадавых этапаў – адбывалася як у хаце нявесты, так і ў хаце жаніха, дзе, напрыклад, гэту пачэсную місію выконвалі трое мужчын, гэта звычайна былі хросны, дзядзька, брат (ці хто-небудзь з радні): «Бралась з-пад дзяжы века, засцілалі яго рушніком і клалі каравай. Хросны ставіў века сабе на галаву і казаў: “Ацец і маць, благаславіце каравай падаць”. Адказ



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

быў: “Бог благаславіць”. І так паўтаралася тры разы. Пакуль каравай неслі да стала, пелі такую песню:

*Караваю, караваю, я для цябе добра граю*
*І з дудкаю, і з скрыпкаю,*
*Што б цябе не спаліці*
*Да ўвесь род абдзяліці*» (в. Міхнаўка) [2, с. 42].

Звычайна тройчы прасілі блаславення, каб пачаць дзяліць каравай: «Каравай ставілі на стол і зноў прасілі благаслаўлення падзяліць каравай: "Ацец і маць, благаславіце каравай падзяліць" –"Бог благаславіць" – тры разы. Потым зразалі вярхушку караваю і аддавалі маці маладой, каб яна перадала яе дачцэ» (Міхнаўка) [2, с. 42].

Калі дзялілі каравай, то заўсёды першымі для пажаданняў, адрасаваных маладым, запрашаліся бацькі. У дадзеным выпадку менавіта бацькі маладога, а потым запрашаліся хросныя бацькі, радня і іншыя госці. Варта адзначыць, што каравай можна было браць «толькі платочкам, голай рукой каравай нельга браць, выказвалі свае пажаданні маладым, выпівалі чарку і аддавалі падаркі. Каравай дзялілі з рознымі жартамі. Напрыклад, баба маладой казала: «“Дару рабу куру, што б узяла мяне мая ўнучка за куму”. Дзед: “А я табе, мая ўнучка, дару пеўня, мне – мяса, а табе – пер’я”. А маладому казаў: "Дару табе нітку, што б не завідываў на чужую лытку”» (в. Міхнаўка) [2, с. 42-43].

Паслявясельная частка на Брагіншчыне мела розныя назвы: «пярэзвы» (в. Міхнаўка), «па бяседах» (в. Савічы), «цыгане» (в. Калыбань), «біць курэй» (в. Залессе), вылучалася жартоўным характарам дзеянняў.

Вясельная абраднасць Брагіншчыны, як сведчаць фактычныя матэрыялы, адрозніваецца адметнымі мясцовымі рысамі і з’яўляецца выдатнай крыніцай для разумення светапогляду нашых продкаў.

**Спіс літаратуры**

1 Малаш, Л. А. Вяселле // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал..: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 575 с.

2 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – Мінск : ЛМФ «Нёман», 2003. – 472 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ